# Традыцыі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў паэзіі Максіма Танка

УДК 821.161.309 «192/193»



**Мікалай МІКУЛІЧ,
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт**

Мікалай МІКУЛІЧ. Традыцыі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў паэзіі Максіма Танка. Артыкул прысвечаны выяўленню ідэйна-эстэтычных традыцый Янкі Купалы і Якуба Коласа ў творчасці Максіма Танка давераснёўскага перыяду. Раскрываючы ролю і значэнне мастацкага вопыту класікаў беларускай літаратуры ў працэсе станаўлення творчай індывідуальнасці М. Танка, аўтар прасочвае арыентацыю маладога заходнебеларускага паэта на іх адраджэнскі аптымізм, народны субстрат вершаў і паэм.
Ключавыя словы: мастацкі вобраз, традыцыі, творчая індывідуальнасць, рамантычна-ўзвышаны пафас, пластыка дыялектычнага аналізу, выяўленчасць, жывапіс словам.

Mikalai MIKULICH. Traditions of Yanka Kupala and Yakub Kolas in the poetry of Maksim Tank. The article explores the ideological and aesthetic traditions of Yanka Kupala and Yakub Kolas in the works of Maxim Tank in 1921-1939. Examining the role of the literary experience of the Belarusian classic authors in the formation of Maksim Tank's creative individuality, the article shows that the young poet from Western Belarus was inspired by their national revival optimism and their poetry based on folk colloquial substrate.
Keywords: literary image, traditions, creative individuality, romantic-sublime pathos, plasticity of dialectical analysis, expressiveness, verbal painting.

Вялікі ўплыў на фарміраванне асобы, станаўленне мастацкай індывідуальнасці Максіма Танка, выпрацоўку асноў яго літаратурнага майстэрства аказала падзвіжніцкая творчая дзейнасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, некаторых іншых беларускіх пісьменнікаў старэйшага пакалення – папярэднікаў і настаўнікаў. Усё найлепшае, што акцэнтавала крытыка ў яго першым зборніку вершаў «На этапах», які стаўся з´явай грамадска-культурнага жыцця Заходняй Беларусі, і іншых кнігах заходнебеларускага перыяду, несумненна, нельга адносіць цалкам на рахунак няхай сабе і недастаткова багатага, але затое вельмі яркага асабістага жыццёвага вопыту аўтара і яго творчага майстэрства. Мы маем на ўвазе «густую» плынь спаконвечнай народнай маральнасці, арганічнае непрынясце, барацьбу супраць сацыяльных і нацыянальных здзекаў і прымусаў, пераследу іншадумства, услаўленне ідэй самакаштоўнасці асобы, нацыянальнага адраджэння, беларускай дзяржаўнасці, а таксама добрую паэтыка-версіфікацыйную выпраўку і інш. Узаемаадносінам з іншымі пісьменнікамі, і найперш сваімі, тут належыць вялікая роля. Складаныя грамадска-палітычныя рэаліі Заходняй Беларусі выклікалі «вострую патрэбу ў непасрэдным працягу нацыянальнай традыцыі рэвалюцыйнай паэзіі. Неабходнасць яе наватарскага развіцця была досыць рана ўсвядомлена Максімам Танкам» *[1, с. 8]*.

## ПРА АЎТАРА

МІКУЛІЧ Мікалай Уладзіміравіч.

Нарадзіўся ў 1960 годзе ў в. Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага (1982), аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1986).

У 1987–2005 гадах працаваў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы: асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры беларускай літаратуры. З 2006 па 2007 год – в. а. вучонага сакратара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2009 года – загадчык аддзела ўзаемасувязей літаратур Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Кандыдат філалагічных навук (1990), дацэнт (1997).

Аўтар каля 450 навуковых работ, у тым ліку 15 кніг і брашур.

Сфера навуковых інтарэсаў: праблемы развіцця беларускай паэзіі XX–XXI стагоддзяў.

## З крыніц жывучых песень



Максім Танк – супрацоўнік газеты «Вілейская праўда». Вілейка. 1940 год

М. Танк з ранніх гадоў ведаў і любіў творчасць Я. Купалы і Я. Коласа, лічыў сябе спадкаемцам традыцый выдатных майстроў слова, аб чым сведчаць многія яго дзённікавыя нататкі, а таксама прысвечаныя народным паэтам мастацкія творы. «У годы свайго станаўлення як паэта, – напамінаў ён у лісце да аўтара артыкула, – арыенцірамі ў маіх пошуках нацыянальнай самасвядомасці, сацыяльнай справядлівасці перадусім была творчасць Я. Купалы і Я. Коласа». У адным з вядомых пасляваенных вершаў «Якубу Коласу» паэт пісаў, прыгадваючы пачатак сваёй літаратурнай працы: «Я ўслухаўся ў сугучча непаўторнае, // Загледзеўся ў мігценне струн тваіх, – // І хлынулі на вочы ліўні зорныя, // І гром напоўніў музыкай мой слых» *[2, с. 98–99]*. У гаворцы пра традыцыі Я. Купалы ў творчасці М. Танка ніяк не выпадае абмінуць неаднойчы цытаваныя даследчыкамі вершы «Янку Купалу» (1940), «28 чэрвеня» (1943), «Янку Купалу» (1947). У іх паэт адзначае, што «ў дні мінулае нядолі» Купалавымі «песнямі народ // Рваў межы, кайданы няволі і прывітаў зары усход», прызнаецца, што на старонках яго «несмяротных кніг» здаўна шукаў і знаходзіў адказы «на ўсе пытанні»: «З крыніц тваіх жывучых песень // Мы ўсе пілі гаючы сок» *[3, с. 82]*.

Несумненна, працэс нараджэння сапраўднага пісьменніка мае глыбокую сацыяльную і гістарычную абумоўленасць. М. Танк, ідучы ў літаратуру, ставіў на мэце выявіць асаблівасці абуджэння чалавечай і нацыянальнай годнасці заходніх беларусаў, росту іх самасвядомасці, настроенасць на рашучую і бескампрамісную барацьбу супраць сіл прыгнёту, палітыкі апалячвання і акаталічвання, якую праводзілі польскія ўлады. «Пра ўсё гэта трэба пісаць у нашым друку, – чытаем запіс у яго „Лістках календара“ ад 16 верасня 1935 года. – Народ можа дараваць пісьменнікам многае, але не можа дараваць маўчання ў часы, калі вырашаецца яго лёс». Літаратурную дзейнасць М. Танк абгрунтавана лічыў сваім «паветрам і хлебам, хлебам і паветрам» *[4, с. 63]*. Не памылімся, калі скажам, што маладому паэту быў блізкі сам адраджэнскі аптымізм, народны субстрат творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, іншых пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя, іх настойлівасць і мэтанакіраванасць, самаадданасць у абароне інтарэсаў прыгнечанага народа, жадання і законнага права беларусаў «людзьмі звацца», паўнакроўнага развіцця нацыянальных культуры і мовы. Падчас нашай сустрэчы і гутаркі ў маі 1993 года, адказваючы на маё пытанне: «Што вам падабалася ў творчасці Янкі Купалы, якія яе рысы асабліва імпанавалі?» – М. Танк заўважыў наступнае: «Ведаеце, у мяне яшчэ захаваўся „Беларускі каляндар“ 1925 года, які я купіў у гімназістаў з суседняй вёскі, што прыехалі дамоў падчас канікул. У гэтым календары якраз я сустрэў верш Я. Купалы „Вёска“: „Лапці ды сярмягі // Як абраз не боскі // Гэта нашы людзі, // Людзі нашай вёскі…“

Пількаўшчына, хутар Жукова, – радзіма Максіма Танка. 1965 год



Якуба Коласа там быў партрэт… Падчас вайны, каб не скурылі партызаны, бацька некаторыя мае паперы і кнігі закапаў у бульбяную яму, дык сёе-тое ацалела…

Ведаеце, тут цяжка выдзеліць, што ў Купалы асабліва падабалася. Усё неяк прамаўляла, будзіла думку, было блізкім мне і родным. Я не буду тут называць нейкія канкрэтныя творы…



**Цікавая сустрэча. Міхась Лынькоў, Макар Паслядовіч, Янка Купала, Максім Танк, Пятрусь Броўка, Яніна Бранеўская. Мінск. 1940 год**

Другой беларускай кнігай, з якой я пазнаёміўся пасля гэтага календара, быў зборнік „Шляхам жыцця"… Я думаю, тут удакладняць нечага, таму што і Янка Купала, і Якуб Колас былі нашымі асноўнымі і правадырамі, і духоўнымі бацькамі…» *[5, с. 26–27]*.

«Купалу я ніколі не адлучаў ад Коласа, – разважаў паэт пазней, улетку 1995 года. – Яны ў мяне неяк заўсёды аб´ядноўваліся. Купала быў выдатнейшым лірыкам, а Колас – эпікам. Заслугі аднаго і другога, па-мойму, ураўнаважваюцца, хоць у нас часцей успамінаюць Купалу. Якубу Коласу далёка да купалаўскай лірыкі, а Янку Купалу далёка да коласаўскай эпікі.

З літаратурай, якая выдавалася ў Савецкай Беларусі, я быў добра знаёмы. У тыя гады я супрацоўнічаў з часопісам „Калоссе", які друкаваў творы многіх аўтараў. Тым больш, што ў бібліятэцы імя Урублеўскіх, дзе быў багацейшы збор усёй саветыкі, загадчыкам беларускага аддзела працаваў вядомы этнограф Пецюкевіч. Па знаёмстве з ім я хадзіў туды, чытаў „Полымя", „ЛіМ", маладнякоўскія часопісы… Новыя творы Купалы і Коласа публікаваліся на старонках заходнебеларускай перыёдыкі. У мяне захаваліся часопісы „Калоссе", „Летапіс ТБШ", у якіх змешчаны цэлыя падборкі вершаў народных паэтаў. Шырока адзначаліся юбілеі Я. Купалы і асабліва Коласа. Зараз не помню, якая гэта была гадавіна, я тады прысвяціў Коласу свой верш „Тры песні". Левае крыло моладзі, студэнцтва, хадэцыя аб´ядналіся і разам адзначалі гэтыя юбілеі…» *[5, с. 23–24]*.

У вершах савецкага часу, прысвечаных Заходняй Беларусі, Я. Купала і Я. Колас, вядома, асуджалі палітыку несправядлівасці і прыгнёту, апалячвання і акаталічвання, якая праводзілася ў дачыненні да беларускага насельніцтва, выказвалі ідэі салідарнасці з заходнімі братамі і іх падтрымкі, заклікалі адстойваць свае правы і свабоды, «рваць путы». Шырокую вядомасць у грамадска-культурных колах «забранага краю» набыў верш Я. Коласа «Беларускаму люду», напісаны неўзабаве пасля заключэння 18 сакавіка 1921 года Рыжскага дагавору. Шчырае, усхваляванае, прамоўніцкае слова народнага песняра гучала рашуча, пранікнёна, адмабілізавана. Яно абуджала надзеі, падтрымлівала веру, актывізавала працэсы кансалідацыі, росту нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

## Судакрананне талентаў

Многія творы народных паэтаў пачатку ХХ стагоддзя сваім праблемна-тэматычным зместам, настраёвым пафасам былі актуальнымі і надзённымі для рэвалюцыйна-вызваленчага і нацыянальна-культурнага руху Заходняй Беларусі, карысталіся папулярнасцю ў народзе («За свабоду сваю», «Не пагаснуць зоры ў небе», «Гэй, наперад» Я. Купалы, «Вясна», «Песня нявολі», «Маці» Я. Коласа і інш.). М. Танк не мог не звярнуць увагі на ўласна мастацка-эстэтычныя пошукі

выдатных нацыянальных майстроў слова, вобразную адметнасць і арыгінальнасць іх творчасці. Яе ідэйна-філасофская і эстэтычная сіла і непераўзыдзенасць уражвалі маладога паэта, нездарма менавіта Я. Купалу і Я. Коласу выслаў ён два экзэмпляры свайго першага зборніка вершаў «На этапах». Адсюль зусім лагічнымі і натуральнымі з´яўляюцца змястава-тэматычныя пераклічкі, вобразнае і рытміка-сінтаксічнае падабенства вершаў Я. Купалы і М. Танка – адпаведна «Родныя песні» і «Песня», «Дзе ні вылеці з няволі…» і «Калі прачынаецца вецер…» і інш.

Малады М.Танк даволі актыўна і плённа развіваў шмат якія характэрныя асаблівасці ідэйна-мастацкага свету паэзіі Я. Купалы. Так, у шэрагу твораў Я. Купалы пачатку стагоддзя, паварочваючыся рознымі гранямі, у той ці іншай ступені раскрываецца культурна-асветніцкая праблематыка. Паэт працягваў адпаведную традыцыю нацыянальнай літаратуры, запачаткаваную яшчэ Ф. Скарынам і прадоўжаную пісьменнікамі XIX стагоддзя. Праграмны верш «Вучыся…», напрыклад, актуалізуе думку аб дужа важнай ролі грунтоўных ведаў, адукацыі на канкрэтным этапе жыццядзейнасці нацыі, у перспектыўным вырашэнні многіх адвечных праблем сацыяльных нізоў. Яны садзейнічаюць росту самасвядомасці беларусаў, станаўленню іх духоўнага ідэалу, пасабляюць «змагацца з нядоляй, з няволяй» *[6, с. 144, 145]*.

«Верш „Вучыся, нябожа", – падкрэсліваў В. Таўлай у артыкуле „Творчасць Янкі Купалы ў барацьбе за ўз´яднанне беларускага народа", – разбудзіў цягу да асветы многіх тысяч людзей. Ён здаваўся як бы адмыслова напісаным для Заходняй Беларусі» *[7, с. 215]*.

Выкарыстоўваючы мастацкі вопыт Я. Купалы, распрацоўваючы гэты аспект ідэйнай праблематыкі яго творчасці, напрыклад, у вершы «Школьнік», М. Танк укладвае ў яго новы, актуальны для заходнебеларускай рэчаіснасці змест, напаўняе матывамі змагання беларусаў за ўз´яднанне ў адзінай дзяржаве: «Ідзеш ты, мой браце, нялёгкай дарогай // Навуку мазольна сабе здабываць. // Сячэ дождж асенні, стаміліся ногі, // Навокал – нікога нідзе не відаць». І невыпадковы тут факт згадвання зборніка вершаў выдатнага паэта: «Лазовыя лапці, аборы апалі, // Кашуля-дзяруга, сярмяжына – з лат, // За пазухай – луста з „Жалейкай" Купалы… // Ну што ж ты задумаўся, брат?» *[8, с. 62]*. На наш погляд, па-свойму знамянальны наступны аспект судакранання талентаў паэтаў. Як неаднойчы падкрэслівалася даследчыкамі (І. Навуменка, М. Ярош і інш.), даволі значнае месца ў творчасці Я. Купалы пачатку стагоддзя належыць тэме і вобразу працы. Праз многія вершы паэта («На старую ноту», «З песень беларускага мужыка» і інш.) скразной ніткай праходзіць думка аб тым, што праца заключае ў сабе вялікія патэнцыяльныя мажлівасці, выкарыстанне якіх можа вывесці на значныя жыццёва-практычныя вынікі, тоіць у сабе перспектывы грамадска-сацыяльных змен. Пры гэтым асноўную стаўку аўтар рабіў на асаблівасці сімвалізацыі вобраза працы, прыём мастацкай умоўнасці і абстрагаванасці. Ва ўсякім выпадку якраз такое адчуванне застаецца пасля прачытання вершаў «Касьба», «Чаго нам трэба» і інш.

**Другі Усесаюзны з'езд савецкіх пісьменнікаў. Справа налева: Максім Танк, Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Кастусь Кірэенка (на другім плане). Георгіеўская зала Вялікага Крамлёўскага палаца. Масква. Снежань 1954 года**



М. Танк, удзельнік і пясняр змагарскага руху народа Заходняй Беларусі, развіваючы і паглыбляючы купалаўскі вобраз працы, шмат у чым відазмяняе яго. У вершах «Палавічнік», «Жнівам», «Жаць ідзе батрачка рана…» і іншых паэт, з аднаго боку, канкрэтызуе і завастрае яго, надзяляе рэальна-гістарычнымі рысамі, а з другога – вобраз працы, як правіла, вырастае ў яго творах на глебе павышанай экспрэсіўнасці перажыванняў, падкрэсленаканцэнтраванага выяўлення жыццёвых працэсаў і супярэчнасцей, узбуйняецца сэнсава і эмацыянальна. Ён выводзіцца на шырокія абсягі філасофска-канцэптуальнай

важкасці і шматмернасці, ператвараецца ў адну з самых значных і характарыстычных духоўна-эстэтычных катэгорый.

У пэўнай ступені асацыятыўнай вобразнасцю, адметнасцю праблемна-тэматычнага плана верш М. Танка «Чорныя скібы» пераклікаецца з вядомым купалаўскім «Аратым».

Думаецца, шмат у чым арыентуючыся на рамантычна-ўзвышаныя, напружана-дынамічныя творы Я. Купалы, М. Танк схіляўся ў сваёй лірыцы да ідэйна-зместавай значнасці і ёмістасці, падкрэсленай канцэнтраванасці вобразна-метафарычнага насычэння радка. Часта ў нязмушанасці прамаўлення, знешняй вяласці і «расхрыстанасці», сінтаксічнай раскутасці паэтавага слова была заключана гранічная ўнутраная сабранасць і скандэнсаванасць, прытоены залежы вялікай энергіі і волі, пачаткі сапраўднага літаратурнага мастацтва. На першы погляд перад намі досыць хаатычна накіданыя штрыхі, а ў іх – цэласная карціна заходнебеларускай рэчаіснасці, гісторыя чалавечага лёсу: «Сцены і неба кавалак між кратаў, // Быццам далёкі азораны шлях. // Ціха. // Крокі наглядчыкаў. // Кашаль з апошніх этапаў. // Вершы – парваныя думкі ў руках» *[8, с. 48]*. Здаецца, якраз да гэтых праграмных радкоў М. Танка адносіцца вядомае заключэнне крытыка М. Гея, што мастацкі твор ёсць «высокаарганізаваная слоўная сістэма, слоўны арганізм, складаная сузалежнасць і спалучэнне структур, такое ўтварэнне, у якім кожная клетачка – элемент цэлага. Яна абавязкова змястоўная сама па сабе («в себе») і, вылучаючы свой гэты змест, яна атрымлівае «назад» новы змест ад гэтага цэлага» *[9, с. 166]*. З усімі на тое падставамі гэты верш трэба разглядаць як матэрыялізацыю адной з самых ёмістых і вычарпальных формул тагачасных ідэйна-мастацкіх шуканняў паэта. Менавіта праз аспекты такой ці блізкай да яе «высокаарганізаванай слоўнай сістэмы», асноўнымі з якіх з'яўляюцца сэнсавая важкасць і канцэнтраванасць, асацыятыўна-метафарычная парадаксальнасць і шматмернасць, маштабнасць і адначасова «рэчыўнасць» малюнка, урэшце, паэтыка-фармальная раскутасць, праходзіла далейшае паглыбленне індывідуальна-аўтарскага пачатку лірыкі М. Танка.



**Якуб Колас, Максім Лужанін, Максім Танк на беразе возера Нарач. 1956 год**

Малады творца, натуральна, адчуваў уплыў прадметна-рэалістычнай школы Я. Коласа. У сваёй «Тэорыі літаратуры» Р. Уэлек і О. Уорэн падкрэслівалі, што «ёсць паэты аб´ектыўныя і суб´ектыўныя. Першыя, як Джон Кітс і Т.С. Эліёт, сцвярджаюць здольнасць паэта „адстараніцца", змясціць у сабе і выявіць свет, адступіўшы ў нечым ад уласнай індывідуальнасці; другія, наадварот, імкнуцца ўсяляк вылучыць сваю індывідуальнасць, даць аўтапартрэт, іх захоплівае споведзь, самавыяўленне» *[10, с. 92]*. Якраз да першых з усёй праавамернасцю можна аднесці Я. Коласа, які «даследаваў жыццё як непераходзячую самацэннасць», «імкнуўся як бы ўзяць і ўзнесці ў слове-вобразе само вечнае ў чалавеку і ў прыродзе», «бачыць з´явы ў іх развіцці і ўзаемнай сувязі» *[11, с. 42]*. Яго ўздзеянне на паэзію М. Танка заключалася ў рэалістычна-пластычным, аб´ектывізавана-дакладным выяўленні драмы народнага жыцця, адлюстраванні бяспраўя і прыніжанасці мужыка-беларуса, форм яго пратэсту, раскрыцці «ціхай красы роднага краю і ўнутранай высакароднасці працаўніка зямлі ў яго смутку і радасцях» (В. Таўлай), паэтызацыі спаконвечных народных традыцый, мовы, яе красы і мілагучнасці.

## Хіне да яго маё сэрца

Цікава адзначыць, што Я. Колас сам адчуваў і неаднаразова падкрэсліваў тыпалагічную блізкасць свайму мастакоўскаму лёсу, дарэвалюцыйнай творчасці танкаўскіх паэтычных шуканняў перыяду 1930-х гадоў, з вялікай сімпатыяй і паважлівай прыхільнасцю ставіўся да маладога калегі. Падчас адной з пасляваенных паездак на Нарач (разам з М. Лужаніным), дзе акрамя М. Танка стала леталі і іншыя беларускія літаратары, ён разважаў: «Максім, Максім… Моцна ён сядзіць каранямі

ў зямлі. Такіх бура не вырывае. Цяжка яму было прабівацца. Вы ўсе па вольнай зямлі хадзілі, а ён спрабаваў голас у такой жа бядзе, як і я калісьці. Толькі на нейкіх трыццаць гадоў пазней. І ў турме таксама пасядзеў. Як толькі ні жартуе час: Максім – чалавек у самай сіле, а я ў дол гляджу, а лёс змушаў яго грызці гэтакі ж чэрствы сухар. Нават у такой самай занядбанай школе вучыўся. Усё гэта вельмі хіне да яго маё сэрца» *[12, с. 76]*.

Акцэнтацыя тыпалагічнай блізкасці жыцця і творчасці М. Танка да свайго творчага лёсу адчуваецца ў вершы Я. Коласа «Максіму Танку», напісаным у 1948 годзе.

М. Танк працягваў традыцыі свайго настаўніка, нёс народу «жывучасць, гаючасць зямлі», складаў песні пра барацьбу і свабоду. Магістральная філасофская і грамадзянска-патрыятычная лінія творчасці Я. Коласа, ва ўсёй сваёй эстэтычнай своеадметнасці сцверджаная ў вершах «Вецер», «Ноч у астрозе», «Песні вясны», «Будзь цвёрды», «У няволі», «Хмары» і інш., знайшла сваё далейшае развіццё і паглыбленне ў тыпалагічна набліжаных да іх танкаўскіх творах – адпаведна «Санет», «У падзямеллі», «Час нам выходзіць…», «Не плач», «Ізноў я тут» і інш. Вершы М. Танка перагукваюцца з творамі Я. Коласа шмат якімі аспектамі ідэйна-зместавага і паэтыка-фармальнага парадку. Вырастаючы на трывалым маральна-філасофскім грунце, герой паэзіі М. Танка, як і творчасці Я. Коласа, паўстае ва ўсёй сваёй духоўнай прывабнасці і сіле, як правіла, абмалёўваецца рэалістычна-праўдзівымі, псіхалагічна-дакладнымі фарбамі.

Досыць сімптаматычным у гэтых адносінах уяўляецца верш «Будзь цвёрды» Я. Коласа, у якім слова паэта набывае выразную прамоўніцкую афарбоўку. Аўтар сцвярджае наступную ідэю: прыгнечаны народ не павінен паддавацца засіллю «багачоў і панства», мусіць сам вырашаць кардынальныя пытанні ўладкавання жыцця, дбаць пра лепшую долю сваіх сыноў і дачок («Ты не гніся, брат, ніколі // Траўкаю пахілай…»): «Не прасі, не спадзявайся // Ты на дапамогу, // Сам з нягодамі змагайся, // Сам прабі дарогу!» *[13, с. 31]*.

Праблемна-тэматычнай асновай, вобразным ладам, рытмічным малюнкам, пафасам да твора Я. Коласа тыпалагічна блізкі верш «Не плач» М. Танка. Ён з´яўляецца своеасаблівым працягам Коласавага верша. Тое, што ў Я. Коласа было фактычна толькі ў зародку, у М. Танка паўстае акрэслена-выразна, выяўляецца на поўную моц. Дзесяцігоддзі раздзяляюць гэтыя творы. Заходнебеларускаму паэту спрыяў сам час, ідэйна-палітычныя і грамадска-сацыяльныя змены і зрухі. У сваім вершы М. Танк сцвярджае самаахвярную вернасць высокім ідэалам нацыянальна-вызваленчай барацьбы, паэтызуе радасць змагарскага яднання аднадумцаў, выяўляе перакананасць у тым, што высілкі дадуць плён, надзеі спраўдзяцца: «Не плач, наш дзень настане, // Хоць адступілі ўчора. // Зацісні моцна рану! // Хай не смяецца вораг! //». І далей : «Выходзьце на дарогу, // Ў паход шчыльней радамі! // Ты ведай, перамога // Ужо не за гарамі» *[8, с. 73]*.

Творчая повязь маладога заходнебеларускага паэта з ідэйна-мастацкімі пошукамі Я. Коласа і Я. Купалы менш за ўсё ўяўляецца статычнай па характары. З часам яе зместавае напаўненне і формы змяняюцца, эвалюцыянізуюць. Калі меркаваць па вершах М. Танка сярэдзіны 1930-х гадоў, вялікае ўздзеянне на аўтара аказалі такія творы Я. Коласа, як паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях» і інш. Прыкладна на гэты час прыпадае імкненне паэта вучыцца ў Я. Коласа ўмельству жывапісаць словам, пластыцы пейзажнай замалёўкі, спасціжэнню таямніцы духоўнага вобліку героя, праніклівай назіральнасці і трапнасці ў адлюстраванні ледзь улоўных псіхалагічных змен («Да дня», «Ткала я, ткала палотны», «Песня кулікоў», «Спатканне» і інш.). Звяртае на сябе ўвагу падкрэсленая адкрытасць мастака ў адносінах да ўспрымання разнастайных сацыяльных працэсаў, павышаная цікавасць да супярэчлівых па сваёй глыбіннай прычынна-выніковай сувязі і ўзаемаабумоўленасці жыццёвых і прыродных з´яў, што таксама набліжае паэзію М. Танка да творчасці Я. Коласа: «Паслухайце, вясна ідзе. // Звініць ў маім акне жалеза. // З вінтоўкай стражнік ноч і дзень // Пільнуе куст пахучы бэзу… // А ён расцвіў, агнём гарыць, // Такім пахучым, мяккім, сінім; // На дрот калючы, на муры, // Як хустку, полымя ўскінуў» *[8, с. 132]*.

Характэрная асаблівасць заключаецца ў тым, што, бадай, на ўсіх этапах свайго творчага развіцця М. Танк, ідучы ў рэчышчы традыцый папярэднікаў, рабіў спробы асэнсаваць праблему сутнасці мастацтва, грамадзянскага прызначэння мастака, яго ролю і адказнасць перад народам і часам. Паварочваючыся рознымі гранямі, гэтая праблема ў шэрагу твораў паэта раскрываецца праз асіміляцыю прыёмаў народнай лірыкі і эпасу і ўласна літаратурных. Даволі пераканаўчы прыклад – паэма «Казка пра Музыку», якая сваёй ідэйна-мастацкай канцэпцыяй, грамадзянскай і псіхалагічнай праблематыкай тыпалагічна набліжана да паэмы «Сымон-музыка» Я. Коласа. Абодва творы глыбока філасофскія паводле характару ўвасаблення ідэі, выяўлення матэрыялу. Аўтары асэнсоўваюць блізкую да свайго вопыту праблему зместу мастацтва, яго нацыянальна-духоўных каранёў, месца і ролю ў сістэме жыццядзейнасці чалавека і народа. У гэтых паэмах стаўка робіцца на іншасказальнасць, фальклорна-казкавы элемент, абедзве яны істотна абапіраюцца на асновы народнай маралі, ідэі антрапамарфізму, акцэнтуюць высокую эстэтыку першаснага,



Цырымонія ўскладання кветак да помніка Янку Купалу падчас свята паэзіі, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта БССР. Старшыня Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк, старшыня прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І.Я. Палякоў, намеснік старшыні Савета міністраў БССР, старшыня Рэспубліканскага юбілейнага камітэта Н.Л. Сняжкова, першы сакратар Саюза пісьменнікаў БССР Ніл Гілевіч, Першы сакратар ЦК КПБ Ц.Я. Кісялёў. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка». 4 ліпеня 1982 года

гармонію і прыгажосць прыроды і душы чалавека. Акадэмік І. Навуменка адзначаў: «У гэтым сэнсе коласаўская творчасць дае вельмі яскравы прыклад амаль поўнага зліцця этычнай, філасофскай думкі пісьменніка з думкай народнай» *[14, с. 127]*.

Памятаеце, як вывярае сваё разуменне свету на багатым сялянскім вопыце дзеда Курылы коласаўскі Сымонка, будучы цвёрда перакананы ў тым, што «Ўсё жыве і душу мае: // Краска, дрэва і жучок» *[15, с. 22]*.

А вось як адгукваецца прырода на чароўнае гранне танкаўскага Музыкі: «Нават дрэва, пачуўшы яго, // Хоць бы нізка да долу // Галіны плакучыя // Звесіла, //Зашуміць, засмяецца, // Атрасаючы пыл, // Закалышацца вецер, // І заскачуць, // Як зайцы, // На полі снапы» *[8, с. 164]*. Вобраз Музыкі паўстае з твора паэта ў рамантычна-гіпербалізаваным плане, такім, якім мы ведаем яго паводле народнага эпасу. Зайграў Музыка з казкі «Музыка і чэрці» – і падалося людзям, «што якаясь слодыч улілася ім у сэрца, а якаясь сіла ўхваціла на плечы і нясе ўсё ўгору і ўгору, к ясным зоркам, у чыстае, сіняе, шырокае неба. Сядзяць яны, нічога не думаючы, забыліся, што рукі і ногі млеюць ад цяжкае работы, што ў жываце бурчыць ад голаду. Сядзяць і слухаюць». Калі ж зайграе ён весела, «пакідаюць мужыкі і бабы косы, граблі, вілы, гаршкі і біклагі, возьмуцца ў бокі і давай скакаць. Скачуць малыя дзеці, скачуць коні, скачуць кусты і лес, скачуць зоркі, скачуць хмаркі – усё скача і смяецца» *[16, с. 2, 4]*.

Рэалістычна-праўдзівыя малюнкі паэты ўдала спалучаюць з узнёсла-рамантычнымі, ідэалізаванымі, пафас бытавой штодзённасці дапаўняецца ў іх паэмах фантастыкай, суседнічае і пераплятаецца з умоўным, загадкава-таямнічым. Уражваюць сваёй псіхалагічнай заглыбленасцю, жорсткай праўдай характараў і абставін тыя карціны твораў, якія расказваюць пра сіроцтва танкаўскага Музыкі, яго сустрэчы са слугамі і Аратым, узаемадачыненні Сымона Я. Коласа і дзеда Курылы, жабрака. Разам з тым асобныя дзеянні герояў выпадаюць з ланцуга рэалістычнай логікі і канкрэтна-гістарычнай абумоўленасці, у чым нам бачыцца арыентацыя аўтараў на нормы фальклорнай фантастыкі. Нельга не пагадзіцца з даследчыкамі (І. Навуменка, І. Багдановіч і інш.), якія лічаць «гіпатэтычным» разрыў Сымона з бацькамі, яго забыўчывасць на роднае котлішча, блізкіх і знаёмых. Шмат у чым фантастычнай уяўляецца карціна выкрадання царскімі слугамі жалейкі Музыкі, супрацьстаянне Волата і Асілка вятрам падчас плавання Музыкі і Вяля і інш.

Наогул, адразу звяртаеш увагу на нетыповасць лёсаў Сымона і Музыкі. Сцвярджаючы думку аб тым, што сапраўднае мастацтва заўсёды захоўвае вернасць інтарэсам народа, прынцыпам высокай духоўнасці, харaства і праўды (супрацоўніцтва талентаў і змрочных сіл здаўна асуджалася сацыяльнымі нізамі) *[17, с. 169]*, Я. Колас і М. Танк свядома ставяць сваіх герояў у экстрэмальныя сітуацыі, выхад з якіх патрабуе не толькі напружаных самастойных высілкаў, але і абавязковай знешняй дапамогі (Сымону пасабляюць пастух Курыла, парабак Яхім, паляшук дзед Даніла; Музыку – Араты,

Асілак, Волат і Вяль). Паэты выяўляюць асаблівасці сацыяльнага абуджэння сваіх герояў, эвалюцыю іх філасофска-светапогляднай сістэмы.

Верш «Тры песні» – адзін з найлепшых у творчасці Максіма Танка даваеннага перыяду. Ён прысвечаны Якубу Коласу, паэт звяртаецца ў ім да сваіх калег па мастацкай творчасці, «скрыпачоў з салаўінымі песнямі», «лірнікаў і песняроў Беларусі»: «Трэба было б пра жыццё саламянае, // Трэба было б галасіста заліцца!..» *[8, с. 94]*. І прапануе ім спачатку прывітаць родныя загоны, рэкі, азёры, палі і бары, «ветру напевы на струнах свабодныя», а затым пайсці «шляхамі паднебнымі, сінімі» па Беларусі і праспяваць тры песні – пра мінулае, сучаснае і будучыню. Першую «песню аб чорным, крывавым прыгоне» («Можаце казкай назваць ці былінаю…»): «Помніце, як упрагалі нас тройкамі, // Як бізуном не адзін быў забіты, // Як раз´язджалі калісь прыганятыя // І катавалі айцы-езуіты» *[8, с. 94]*. Другая песня – пра заходнебеларускую рэчаіснасць: «Хмары павіслі над краем цямнейшыя, // Хмары над хатамі і над народам. // Кажуць – зрачыся курганаў і спадчыны! // Кажуць – ісці нам у сцюжу, у слоту!» *[8, с. 95]*.



**Аўтографы на памяць… На свяце «Дзень горада». Мінск. 1984 год**

Аднак галоўную стаўку паэт рабіў на трэцюю песню («З намі ж ідзе яна ў свет бураломам!»), якая звязана з цяжкім змаганнем «за лепшую долю» народа і яго шчаслівую будучыню, што, несумненна, неўзабаве наступіць: «Раны і межы краіна залечыць, // Плечы расправіць шырока магутныя, // Прыйдзе народ на вялікае веча. // Сонцам зазвоняць палеткі ўзараныя, // Закаласяцца густымі жытамі; // Ворагам лютым магілы стаптаныя // Новыя вёсны асыплюць вянкамі!..» *[8, с. 96]*.

Даведаўшыся ў маі 1939 года, што Якуб Колас «быццам збіраецца ў Парыж і, магчыма, на пару дзён спыніцца ў Вільні ці ў Варшаве», М. Танк па даручэнні кіраўніцтва падполля падрыхтаваў прачулы ліст да народнага паэта БССР.

«Дарагі дзядзька Якуб Колас! – пісаў паэт. – Да нас дайшла радасная вестка, што Вы збіраецеся наведаць сваю радзіму. Якое б гэта было шчасце для ўсіх землякоў – пабачыць Вас, пачуць Вашы словы – словы нашага народнага паэта і аднаго з перадавых будаўнікоў таго новага жыцця, за якое змагаюцца сёння мільёны людзей ва ўсім свеце.

Цяжкія абставіны, у якіх мы працуем, шмат каго змусілі адступіць з перадавых пазіцый літаратуры ці змоўкнуць назаўсёды. Але растуць новыя сілы, складаюцца новыя песні за калючымі дратамі Бярозы, за кратамі Лукішак і іншых астрогаў і катоўняў. І гэтых песняў не заглушыць ні свістам паліцэйскіх нагаек, ні звонам кайданоў». І далей: «Я ўжо некалькі разоў браўся за пяро, каб пра ўсё гэта Вам напісаць, але баяўся Вас непакоіць. Ды і слабая была надзея, што наш голас зможа прарвацца праз усе цэнзурныя і пагранічныя заставы і дайсці да Вас…». І ў канцы пісьма: «За апошнія гады мы разаралі шмат межаў, і таму, прыступаючы да новай веснавой сяўбы, хочацца параіцца, спытацца ў Вас: ці добра мы сеем, ці хутка зліюцца нашы хвалі каласоў у адно бясконцае мора, калі сустрэнуцца ў братэрскім поціску нашы рукі, калі за супольным бяседным сталом зазвіняць нашы вольныя песні?» *[4, с. 265]*.

## Побач з «вялікім сузор´ем»

Думаецца, арыентуючыся шмат у чым на творчую дзейнасць Я. Купалы і Я. Коласа, малады М. Танк, як мала хто іншы з заходнебеларускіх пісьменнікаў, паэзію шукаў і знаходзіў у актыўным дзеянні, напружанай працы, ахвярнай барацьбе. У яго свядомасці будзённа-побытавае цесна пераплецена з лятункава-ідэальным, матэрыяльна-рэчыўнае арганічна дапаўняецца духоўна-эстэтычным, літаратурна-мастацкае лучыцца з народна-патрыятычным, рэвалюцыйным, аб чым красамоўна сведчаць, напрыклад, дзённікавыя нататкі «Лісткі календара».

«Зморaны, позна вярнуўся з літаратурнага вечара дамоў, – запісвае паэт 15 сакавіка 1936 года. – Чытаў «Спатканне», «Да дня», «У маршы», а на «біс» – «Акт першы». Калі падхапілі мяне студэнты і пачалі падкідаць, я больш за ўсё баяўся, каб хаця на маім азадку не распаўзліся старыя, яшчэ на Лукішках працёртыя штаны» *[4, с. 94]*. А гэтыя характарыстычныя

радкі датуюцца 23 кастрычніка: «Учора ў 10 гадзін вечара прыйшоў паліцыянт і ўручыў мне павестку з´явіцца ў следчы аддзел як западозранаму… Ужо маю дзве павесткі: адна – на сённяшні дзень, другая – на 24 кастрычніка. Усё цягаюць за мой канфіскаваны зборнік. Узяўся чытаць Д. Лондана. Перапісаў вершы, з якімі абяцаў выступіць на студэнцкім вечары. А можа, яшчэ і не давядзецца выступаць, бо чорт ведае чым могуць кончыцца гэтыя няспынныя выклікі на допыты» *[4, с. 136]*.

«Ужо другі тыдзень ляжу дома хворы, – чытаем наступны запіс паэта (ад 15 снежня 1936 года). – Страшэнная слабасць. Няма грошай ні на яду, ні на лякарствы, ні на дактароў. Лячуся паэзіяй, якую раней лічыў нейкім ілюстраваным дадаткам да свайго жыцця, да сваёй працы, а зараз – сам у яе на пабягушках. Хочацца хутчэй закончыць „Нарач“, а паэма ўсё больш і больш разрастаецца. Каб не згубіліся яе фрагменты ў нейкіх судовых актах, перапісваю і аддаю на перахаванне дзядзьку Рыгору і іншым сваім знаёмым» *[4, с. 141]*. І яшчэ: «Настаў сапраўдны голад. Напісаў дамоў, каб што падаслалі. Ніяк не магу знайсці работу. Чуў, што быццам ёсць пасада кантралёра білетаў на катку, але каб і яе атрымаць – трэба мець пратэкцыю ў магістраце. Пачаў чытаць К. Гамсуна, ды разбалелася галава і кнігу мусіў адкласці. Незакончанымі ляжаць на стале вершы пра катаргу шарварачных дарог і пра жыццё „халупнікаў“ – пра жыццё самых забітых і бяспраўных рабочых у Польшчы… Голад. Горшы, як у астрозе. Там, калі і бывае галадоўка, дык галадаем усе разам. Так галадаць весялей… Каб не марнаваць сіл, да мінімуму скараціў свае вандроўкі па Вільні. За апошнюю галодную дэкаду прачытаў каля дваццаці кніг: А. Якімовіча «Вершы», Дудара «Сонечнымі сцежкамі» і «Беларусь бунтарская», Дубоўкі Credo, Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі», Хурсіка «Першы паўстанак», Чорнага «Срэбра жыцця» і «Апавяданні», Бабарэкі «Апавяданні». Да гэтага яшчэ: А. Васілеўскага, А. Фарэля, Давідова, М. Прэво, Аскара Уайльда. Вось колькі спажыў духоўнай стравы! Можа, і грэх называць гэту дэкаду „галоднай“?». Запіс ад 23 лютага 1938 года *[4, с. 198–199]*.

Яўген Скурко (Максім Танк), працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі (1932–1933), у гэты час і пазней займаўся закладкай падпольных камсамольскіх гурткоў і ячэек на Гродзеншчыне і Віленшчыне. Падчас турэмнага зняволення на Лукішках паэт выдаваў рукапісны часопіс «Краты» (усяго выйшла 6 нумароў). У 1936 годзе ён быў прыняты ў КПЗБ. У другой палове 1930-х гадоў М. Танк працаваў у віленскіх легальных народнафронтаўскіх выданнях – кіраваў літаратурным аддзелам у газеце «Наша воля», вёў беларускую калонку ў польскай газеце Po prostu, а таксама цесна супрацоўнічаў з часопісамі «Беларускі летапіс», «Калоссе» і інш.

Малады Яўген Скурко вучыўся ў чатырох гімназіях, аднак ніводнай з іх не закончыў: Першую, Вілейскую рускую, якая знаходзілася ля самай мяжы з Савецкім Саюзам, з-за нарастання ў ёй падпольнага руху закрылі польскія ўлады, з другой, Радашковіцкай беларускай, і трэцяй, Віленскай беларускай, ён быў адлічаны за непадпарадкаванне адміністрацыі і ўдзел у забастовачным руху пратэсту, а падчас навучання ў чацвёртай, Віленскай рускай, паэта-пачаткоўца непасрэдна ў класе арыштавала польская паліцыя і кінула ў турму на Лукішкі.

Цікава, што ўжо на самым раннім этапе творчасці шмат хто з даследчыкаў прыгожага пісьменства, грамадска-культурных дзеячаў Заходняй Беларусі прадказваў М. Танку вялікія перспектывы развіцця, а некаторыя з іх па часе бачылі талент паэта побач з «вялікім сузор´ем» яго настаўнікаў Купалы і Коласа.

«Яго мастацкая муза зарадзілася ў звонкім шуме медна-сасновага наднарачанскага бору, – падкрэсліваў у прадмове „Матывы творчасці Максіма Танка“ да зборніка „На этапах“ Р. Баравы (Рыгор Шырма). – Чорныя скібы палёў, пеністыя хвалі Нарачы і Мястра, а пазьней шырокія этапныя дарогі былі яе калыскай. Гадавалася яна разам з поэтам „пад шум непагоды“, пад крык кагарак і звон кайданоў, пад „песьні чорнай зямлі“ і рыбацкіх арцеляў». У канцы артыкула Р. Баравы падагульняў: «Закончыўшы свой першы этап, Максім Танк прышоў у беларускую літаратуру з гэтым зборнікам і тут, на нашым Заходнім небасхіле, ня гледзячы на тыя ці іншыя недахопы, якія трудна абмінуць пры пачатку літаратурнай творчасьці, адразу загарэўся зоркай першай велічыні. Думаем, што нам яшчэ прыдзецца быць сьведкамі, калі ягоны талент падымецца да Вялікага Сузор´я – Купалы-Коласа» *[18, с. VII–VIII, XVI]*.

Бязмежную павагу і любоў да сваіх папярэднікаў і настаўнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа Максім Танк захавае і пранясе праз усё жыццё. У многіх вершах, напісаных у пасляваенны час і прысвечаных класікам беларускай літаратуры, – «Якуб Колас збірае грыбы» (1969), «Ля помніка Янку Купалу» (1973), «Ля помніка Якубу Коласу» (1974), «Сустрэча з Янкам Купалам» (1974) і інш., – паэт адзначыць сваю залежнасць ад іх вопыту і традыцый, падкрэсліць вялікі ўклад народных паэтаў у развіццё беларускай мовы і літаратуры, у фарміраванне беларускай нацыі і ў цэлым у дзяржаўна-культурнае будаўніцтва Беларусі.

Абапіраючыся на ідэйна-эстэтычныя набыткі і дасягненні сваіх папярэднікаў, найперш Я. Купалы і Я. Коласа, М. Танк імкнуўся асэнсоўваць з´явы і працэсы заходнебеларускай рэчаіснасці ў іх анталагічным змесце, бачыць іх

духоўна-сацыяльную прыроду, асноватворную сутнасць і напоўненасць, перспектывы далейшага развіцця. Глыбокім адчуваннем героікі часу, рамантычнай узвышанасцю драматычнага перажывання, патрыятычнай ахвярнасцю дыхалі многія творы паэта з кніг заходнебеларускага перыяду «Журавінавы цвет» (1937), «Нарач» (1937), «Пад мачтай» (1938).

Мастацкі стыль Максіма Танка характарызаваўся падкрэсленай ёмістасцю і шматграннасцю зместу: лірыка-апавядальны, падзейна-эпічны пачатак спалучаўся ў ім з рэфлексіўна-медытатыўным, філасофскім; выкрывальна-сатырычная плынь дапаўнялася і падсвечвалася прамоўніцка-публіцыстычнай. Многім яго вершам («Калі няма на свеце маёй мовы…», «У падзямеллі», «Шэрыя хаты, платы і вароты…», «Лісце каштанаў» і інш.) у значнай ступені была ўласціва рэалістычная канкрэтнасць адлюстравання, прадметная выразнасць жывапіснага малюнка, непасрэднасць і дакладнасць душэўна-псіхалагічнага перажывання. Яны з´яўляліся носьбітамі засяроджанага філасофскага роздуму аўтара, іранічнага высмейвання, лірыка-сатырычнага выкрыцця ім апанентаў і непрыяцеляў, крытычна-з´едлівай іскрамётнасці і палемічнага пафасу. М. Танк распрацоўваў кананічны, сабраны і разняволены верш, верлібр, выкарыстоўваў традыцыйныя, добра апрацаваныя шматлікімі папярэднікамі і наватарскія, індывідуальна-аўтарскія сродкі мастацкай выразнасці.

Несумненна, усе гэтыя якасці творчасці Максіма Танка сталі магчымы дзякуючы арыентацыі заходнебеларускага паэта на ідэйна-мастацкія пошукі сваіх папярэднікаў і настаўнікаў – вялікіх Янкі Купалы і Якуба Коласа.

***Фота з адкрытых крыніц***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.05.2022 г.*

## [ СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ]


1. Арочка, М.М. Максім Танк: жыццё ў паэзіі / М.М. Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 272 с.
2. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М.Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – Т. 2: Вершы (1939–1954). – 566 с.
3. Янку Купалу. – Мінск: Выд.-ва АН БССР, 1949. – 272 с.
4. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – Т. 9: Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 592 с.
5. Мікуліч, М. Максім Танк: на скразняках стагоддзя / М. Мікуліч. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 254 с.
6. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1995. – Т. 1: Вершы, пераклады 1904–1907. – 462 с.
7. Таўлай, В. Творы / В. Таўлай. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1961. – 404 с.
8. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – Т. 1: Вершы (1930–1939). – 374 с.
9. Гей, Н.К. Искусство слова: о художественности литературы / Н.К. Гей. – М.: Наука, 1967. – 292 с.
10. Уэллек, Р. Теория литературы; пер. с англ. / Р. Уэллек, О. Уоррен. – М.: Прогресс, 1978. – 374 с.
11. Лойка, А.А. Беларуская паэзія пачатку ХХ стагоддзя: некаторыя заканамернасці і асаблівасці / А.А. Лойка. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1972. – 365 с.
12. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе: аповесць-эсэ / М. Лужанін. – Мінск: Маст. літ, 1982. – 465 с.
13. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – Т. 2: Вершы (1911–1938). – 467 с.
14. Навуменка, І.Я. Якуб Колас: духоўны воблік героя / І.Я. Навуменка. – 2-е выд., дап. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1981. – 367 с.
15. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – Т. 9: Паэма «Сымон-музыка». – 553 с.
16. Сержпутовский, А.К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков / А.К. Сежпутовский. – СПб: Типо-Литография К.Л. Цевтковского, 1911. – 365 с.
17. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 345 с.
18. Баравы, Р. Матывы творчасці Максіма Танка / Р. Баравы // На этапах: вершы / М. Танк. – Вільня, 1936. – С. VII–XVI.